These definitions make it possible to understand more accurately the essence of such economic categories as "efficiency", "effectiveness", "cost-effectiveness" and "productivity". These definitions are the basis for further defining the efficiency of industrial innovations at the pre-planning stage. Pre-planning assessment allows to increase the efficiency of implementation of industrial innovations in order to improve the competitive position, increase financial stability and economic growth of the enterprise.

***Sources and literature***


1. Kravchuk A. V., Pererva P. G. Mekhanizm peredplanovoi otsinky promyslovykh innovatsii. *XII Mizhnarodna naukovo-praktychna konferentsiia mahistrantiv ta aspirantiv: materialy konf. (17−20 kvitnia 2018 r.).* U 3 ch. Ch. 1/red. Ye. I. Sokol. Kharkiv: NTU "KhPI", 2018. S. 190. URL: http://repository.kpi.kharkov.ua/handle/KhPI-Press/36489
2. Akuliushyna M. O. Vyznachennia mekhanizmu peredplanovykh doslidzhen investytsiino-innovatsiinykh proektiv dlia promyslovykh pidpryiemstv. *Ekonomika: realii chasu.* 2013. № 3 (8). S. 131–139.
3. Kravchuk A. V. Analiz isnuiuchykh metodiv ekonomichnoi otsinky efektyvnosti promyslovykh innovatsii. *Visnyk KrNU imeni Mykhaila Ostrohradskoho.* 2019. Vyp. 2/2019 (115). S. 69−78. DOI: 10.30929/1995-0519.2019.2.69-78
4. Bespaliuk Kh. M. Upravlinnia innovatsiinoiu diialnistiu pidpryiemstva na osnovi planuvannia zhyttievykh tsykliv tovariv. *Visnyk Natsionalnoho universytetu "Lvivska politekhnika".* 2010. S. 188−195.
5. Pererva P. G., Kravchuk A. V. Efektyvnist yak ekonomichna katehoriia. *Visnyk Natsionalnoho tekhnichnoho universytetu "Kharkivskyi politekhnichnyi instytut" (ekonomichni nauky): zb. nauk. pr.* Kharkiv: NTU "KhPI", 2018. № 15 (1291). S. 137−143. URL: http://repository.kpi.kharkov.ua/handle/KhPI-Press/36344


**Мішкевіч Ю.** − студэнтка
Навуковы кіраўнік: к. э. н., дац.
Т. Бондар
Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

## Праектнае фінансаванне як інструмент павышэння інавацыйнай актыўнасці арганізацый

У Рэспубліцы Беларусь інавацыі разглядаюцца ў ролі драйвера паступальнага развіцця нацыянальнай эканомікі. Беларуская дзелавая супольнасць адназначна ўсвядоміла, што толькі інавацыі забяспечваюць вытворчасць тавараў з найноўшымі ўласцівасцямі і характарыстыкамі, недасяжнымі ў рамках папярэдніх тэхналагічных укладаў. Без інавацый нельга дасягнуць прагрэсу ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. У гэтай сувязі асаблівую ролю набывае праблема арганізацыі інавацыйнай дзейнасці, яе фінансавага забеспячэння.

Фінансаванне інавацый, як вядома, можа ажыццяўляцца рознымі спосабамі. Аднак, ва ўмовах абмежаванасці рэсурсаў, велізарнага кошту інавацыйных праектаў і высокага узроўня іх рызык, інвестары ўсё часцей звяртаюцца да праектнага фінансавання. Спрыяючы выкарыстанню праектнага фінансавання на практыцы, у гэтай працы мы сістэматызуем даступную інфармацыю аб яго арганізацыі, яго вартасцях і недахопах.

Па-першае, адзначым, што яго сутнасць заключаецца ў такім тыпе арганізацыі фінансавання, калі даходы, атрыманыя ад рэалізацыі праекта, з'яўляюцца адзінай крыніцай пакрыцця даўгавых абавязацельстваў. Гэта дазваляе пераадолець рэсурсныя абмежаванні, звязаныя з фінансаваннем капіталаёмістых і стратэгічна важных інфраструктурных і прамысловых інвестыцыйных праектаў. Акрамя гэтага, праектнае фінансаванне зніжае рызыкі, дзякуючы вялікай колькасці ўдзельнікаў.

Па-другое, звернем увагу на тое, што ў залежнасці ад таго, якую долю рызыкі прымаюць на сябе крэдыторы, вылучаюць наступныя тыпы праектнага фінансавання:

© *Мішкевіч Ю., 2020*

– з поўным рэгрэсам на пазычальніка: крэдытор не нясе адказнасці за праектныя рызыкі; прадастаўленне сродкаў пад пэўныя гарантыі; магчымасць атрымання сродкаў на працягу невялікага адрэзка часу; невысокі кошт крэдыту (часцей за ўсё выкарыстоўваюць для рэалізацыі малапрыбытковых і некамерцыйных праектаў);

– з абмежаваным рэгрэсам на пазычальніка: крэдытор толькі часткова ускладае на сябе рызыкі праекта;

– без рэгрэсу на пазычальніка: крэдытор цалкам ускладае на сябе рызыкі, звязаныя з ажыццяўленнем праекта (фінансуюцца праекты, якія характарызуюцца высокай чаканай прыбытковасцю, прагрэсіўнымі тэхналогіямі вытворчасці прадукцы, добра развітымі збытавымі сеткамі) [1].

Па-трэцяе, акцэнтуем увагу яшчэ на адным важным арганізацыйным моманце: у мэтах рэалізацыі праекта крэдыторы ствараюць праектную кампанію. Усе крэдыты і плацяжы адлюстроўваюцца на балансе гэтай арганізацыі, а не на балансе заснавальнікаў, што магло б пагоршыць іх фінансавае становішча. Дадзены метад атрымаў назву «па-за балансу» і заключаецца ў тым, што ўдзельнікі праекта не нясуць субсідыярную адказнасць па абавязацельствах ініцыятара. Варта адзначыць, што, калі пры звычайным крэдытаванні праекта банкі прымаюць пад увагу вынікі фінансавай дзейнасці пазычальніка, яго рэпутацыю, то пры стварэнні праектнай кампаніі банкі засяроджваюць сваю ўвагу на ацэнцы самога праекта і яго гарантыях [1; 2].

Па-чацвёртае, адзначым, што праектнае фінансаванне не пазбаўлена недахопаў, якія трэба прымаць да ўвагі, плануючы яго выкарыстанне: а) праектнае фінансаванне з’яўляецца складаным арганізацыйным і фінансавым мерапрыемствам з-за неабходнасці кантролю за справядлівым размеркаваннем выдаткаў, даходаў, рызык; б) апора ў інавацыйнай дзейнасці выключна на праектнае фінансаванне стрымлівае развіццё больш радыкальных інавацый, так як яго арганізатары не ідуць на вялікую рызыку, а, менавіта з радыкальнымі інавацыямі звязваюцца гучныя навуковыя адкрыцці, прарыўныя вынаходкі, якія фармуюць новы тэхналагічны ўклад; в) праектнае фінансаванне па дыяпазоне свайго выкарыстання прайграе венчурнаму фінансаванню інавацый – яно можа быць ужыта толькі ў дачыненні да тых прадуктаў, на якія ўжо сфармаваны камерцыйны попыт.

Такім чынам, праектнае фінансаванне-гэта найважнейшы фінансавы інструмент, які дазваляе мабілізаваць досыць вялікія аб’ёмы фінансавых рэсурсаў для рэалізацыі капіталаёмістых і высокарызыкоўны праектаў, з перспектывай пагашэння даўгавых абавязацельстваў за кошт атрыманага прыбытку. Эфектыўнасць прымянення праектнага фінансавання залежыць ад шматлікіх фактараў: наяўнасці яго заканадаўчай і нарматыўна-прававой базы, забяспечанасці высокакваліфікаванымі ўдзельнікамі інавацыйных праектаў; празрыстасці інфармацыі аб праекце; магчымасці абмену вопытам у гэтай сферы, стварэння камунікацыйных сістэм для ўзаемадзеяння ўдзельнікаў.

***Крыніцы і літаратура***

1. Філіпава Л. Я. Праектнае фінансаванне: асаблівасці арганізацыі і перспектывы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь. *Беларускі эканамічны часопіс*. 2018. № 4. С. 148–159.
2. Пераверзева В. В. механізм праектнага фінансавання пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. *Веснік РЭУ ім. Г. В. Пляханава.* 2018. № 3 (99). С. 24–32.

**Мучичко К.** – студентка
Науковий керівник: к. пед. н., доц. Л. Бобко
Львівський національний університет імені Івана Франка, м. Львів, Україна

## Управління іноваціями на підприємстві

У даний час стратегічне управління інноваціями та розвитком підприємств є досить важливим, оскільки воно зосереджується на потребах споживачів, дозволяє забезпечити більш

© *Мучичко К., 2020*